# З'езд будаўнікоў камунізма



МАСКВА. 17 кастрычніка. XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.
НА ЗДЫМКУ: у прэзідыуме з'езда. На трыбуне М. С. ХРУШЧОЎ.

## На XXII з'ездзе Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

**17 кастрычніка, у 10 гадзін раніцы, у Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў пачаў работу чарговы XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.**

**З'езд адкрыў уступнай прамовай Першы сакратар ЦК КПСС таварыш М. С. Хрушчоў.**

**З'езд выбраў Прэзідыум з'езда, Сакратарыят, Рэдакцыйную камісію і Мандатную камісію.**

**Зацвярджаецца наступны парадак дня з'езда:**

**1. Справаздача Цэнтральнага Камітэта КПСС—дакладчык Першы сакратар ЦК КПСС тав. М. С. Хрушчоў.**

**2. Справаздачны даклад Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі КПСС—дакладчык старшыня Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі тав. А. Ф. Горкін.**

**3. Праект Праграмы КПСС — дакладчык тав. М. С. Хрушчоў.**

**4. Аб змяненнях у Статуце КПСС — дакладчык Сакратар ЦК КПСС тав. Ф. Р. Казлоў.**

**5. Выбары цэнтральных органаў партыі.**

**Са справаздачай Цэнтральнага Камітэта КПСС выступіў Першы сакратар ЦК КПСС тав. М. С. Хрушчоў, горача сустрэты дэлегатамі і гасцямі з'езда.**

**Затым з'езд заслухаў справаздачны даклад Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі КПСС, з якім выступіў старшыня Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі КПСС тав. А. Ф. Горкін.**

* * *

**18 кастрычніка ў Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, працягваў сваю работу чарговы XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.**

**З'езд прыняў рашэнне заслухаць даклад аб праекце Праграмы КПСС з тым, каб абодва пытанні парадку дня: справаздача Цэнтральнага Камітэта і праект Праграмы КПСС абмяркоўваць адначасова.**

**З дакладам аб праекце Праграмы КПСС выступіў Першы сакратар ЦК КПСС тав. М. С. Хрушчоў, сустрэты гарачымі апладысментамі дэлегатаў і гасцей з'езда.**

* * *

**18 кастрычніка** к 10 гадзінам раніцы дэлегаты XXII з'езда КПСС, шматлікія госці, прадстаўнікі васьмідзесяці зарубежных Камуністычных і рабочых партый зноў запоўнілі велізарную залу Крамлёўскага Палаца з'ездаў. Пачаўся другі дзень работы вялікага форума будаўнікоў камунізма.

Дэлегаты і госці ўстаюць, дружнымі апладысментамі вітаючы членаў прэзідыума з'езда.

Старшынствуючы тав. М. А. Суслаў, адкрываючы ранішняе пасяджэнне, прапануе заслухаць даклад аб праекце Праграмы КПСС з тым, каб абодва даклады—справаздачу Цэнтральнага Камітэта і даклад аб праекце Праграмы КПСС—абмяркоўваць адначасова. З'езд прымае гэтую прапанову. Слова для даклада аб праекце Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза даецца Першаму сакратару Цэнтральнага Камітэта партыі таварышу М. С. Хрушчову. З'яўленне на трыбуне М. С. Хрушчова ўсе ўдзельнікі з'езда сустракаюць гарачымі працяглымі апладысментамі.

Даклад тав. М. С. Хрушчова, які працягваўся на працягу ранішняга і вячэрняга пасяджэнняў, быў выслухан з вялікай увагай і неаднаразова перапыняўся бурнымі апладысментамі.

Вялікі план нашай партыі—план пабудовы камуністычнага грамадства цалкам захапіў увагу прысутных у зале. Кожны з дэлегатаў з пачуццём глыбокай радасці ўсведамляў, што яму выпала гістарычная місія ад імя мільёнаў зацвердзіць новую Праграму КПСС і прыняць самы актыўны ўдзел у яе выкананні, ажыццявіць запаветную мэту партыі, усяго савецкага народа.

Пасля заканчэння даклада дэлегаты і госці з'езда ў аднадушным парыве ўстаюць і наладжваюць працяглую авацыю. Раздаюцца воклічы «Ура!», «Няхай жыве Камуністычная партыя!», «Няхай жыве ленінізм!», «Няхай жыве ленінскі Цэнтральны Камітэт!», «Няхай жыве камунізм!».


*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 30 (461) | Серада, 25 кастрычніка 1961 г. | Цана 1 кап.


## На XXII з'ездзе Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

**17 кастрычніка 1961 года.** Маскоўская раніца. Крэмль. Родны, прывычны, з рубінамі чырвоных зорак. Цвет партыі, усяго савецкага народа, лепшыя людзі краіны прыйшлі сёння сюды, у новае цудоўнае збудаванне са шкла і мармуру—Крамлёўскі Палац з'ездаў. Ветэраны рэвалюцыйных баёў, героі першых пяцігодак, ініцыятары цудоўных здзяйсненняў апошніх гадоў, калі савецкія людзі, здзіўляючы свет, першымі вырваліся ў космас, сабраліся на найвялікшы камуністычны форум, каб прыняць першую ў гісторыі чалавецтва праграму пабудовы камунізма.

Да з'езда КПСС прыкавана ўвага ўсяго свету. Прагрэсіўнае чалавецтва вітае наш народ, нашу партыю як сцяганосца новай эпохі, вяшчальніка высокародных гуманістычных ідэалаў. Велізарную цікавасць у свеце выклікаў праект новай Праграмы КПСС—гэты Маніфест Камунізма, які ўсталёўвае на зямлі Мір, Працу, Свабоду, Роўнасць, Брацтва і Шчасце ўсіх народаў.

Час набліжаецца к дзесяці гадзінам. Цёпла вітаюць дэлегаты з'езда кіраўнікоў раду дэлегацый братніх марксісцка-ленінскіх партый, якія займаюць месцы ў прэзідыуме.

Роўна 10 гадзін раніцы. Бурнымі, працяглымі апладысментамі сустракае з'езд з'яўленне членаў Прэзідыума Цэнтральнага Камітэта КПСС—баявога штаба нашай вялікай партыі. Усе ўстаюць.

З велізарнай увагай слухаюць дэлегаты і госці ўступную прамову Першага сакратара ЦК КПСС таварыша Мікіты Сяргеевіча Хрушчова.

Па даручэнню Цэнтральнага Камітэта таварыш М. С. Хрушчоў уносіць прапанову пачаць работу з'езда і аб'яўляе XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза адкрытым.

Таварыш М. С. Хрушчоў паведамляе, што на XXII з'езд партыі прыбылі дэлегацыі ад 80 зарубежных марксісцка-ленінскіх партый. Ад імя з'езда ён горача вітае дэлегацыі дружалюбных братніх партый, а таксама перадае сяброўскае сардэчнае прывітанне прысутным на з'ездзе дарагім гасцям—прадстаўнікам дэмакратычных нацыянальных партый незалежных дзяржаў Афрыкі. І кожны раз, як толькі М. С. Хрушчоў называе дэлегацыю і яе кіраўніка, у зале раздаюцца гарачыя апладысменты.

З'езд аднагалосна выбірае кіруючыя органы: Прэзідыум, Сакратарыят, Рэдакцыйную і Мандатную камісіі.

Затым зацвярджаецца парадак дня з'езда.

Старшынствуючы на пасяджэнні тав. Ф. Р. Казлоў дае слова для справаздачы Цэнтральнага Камітэта КПСС Першаму сакратару ЦК КПСС тав. М. С. Хрушчову. Дэлегаты і госці гарачымі апладысментамі сустракаюць Мікіту Сяргеевіча Хрушчова. Усе ўстаюць.

Затым на вячэрнім пасяджэнні быў заслухан справаздачны даклад з'езду Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі КПСС, які зрабіў старшыня Рэвізійнай камісіі тав. А. Ф. Горкін.

**19—24 кастрычніка з'езд працягваў сваю работу.**

## ПРЫВІТАННЕ XXII З'ЕЗДУ КПСС

**Камсамольскі сход фізічнага факультэта універсітэта паслаў у Маскву прывітальную тэлеграму XXII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.**

**«З пачуццём гордасці і ўдзячнасці,—гаворыцца ў тэлеграме,—сочым мы за плённай работай XXII з'езда нашай роднай партыі, якая прымае на сваім з'ездзе разгорнутую праграму будаўніцтва камунізма ў нашай краіне. Запэўніваем удзельнікаў з'езда, што мы аддадзім усе свае сілы вучобе, прыкладзем усе намаганні для ператварэння гэтай велічнай праграмы ў жыццё».**

**Па даручэнню сходу**
**ПРЭЗІДЫУМ.**

# Наш новы вучэбны корпус

ЗАКОНЧАНА будаўніцтва новага галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Гэта — другое па велічыні грамадзянскае збудаванне ў сталіцы рэспублікі. Па свайму аб'ему—112 000 кубічных метраў — яно ўступае толькі Дому ўрада.

Карысная плошча ўсяго корпуса складае больш чым 20 тысяч квадратных метраў. Гэта ў паўтара раза перавышае ўсё тое, што маюць існуючыя тры вучэбныя будынкі на тэрыторыі універсітэцкага гарадка.

Аздоблены шэрым гранітам партал галоўнага ўваходу вя[illegible] вестыбюль. Дзве шырокія лесвіцы звязваюць яго з верхнімі паверхамі. У будынку, дзе ёсць 330 пакояў, размесцяцца аўдыторыі, кабінеты, навучальныя і праблемныя лабараторыі, розныя дапаможныя і адміністрацыйныя памяшканні. Адных аўдыторый у галоўным корпусе налічваецца больш чым 70.

У новым корпусе БДУ для студэнтаў і выкладчыкаў ствараюцца ўсе ўмовы для плённай навучальнай і навуковай работы.

Шматлікія лабараторыі і кабінеты атрымліваюць навейшае навучальнае і лабараторнае абсталяванне, розныя ка[illegible]чай работы, у тым ліку па ядзернай фізіцы і фізіцы цвёрдага цела. Ва універсітэцкі вылічальны цэнтр паступіць яшчэ адна больш дасканалая электронна-вылічальная машына.

У новым корпусе ёсць вялікая актавая зала на тысячу месц з кінаўстаноўкай, бібліятэка з кнігасховішчам на 500 тысяч тамоў і чатырма чытальнымі заламі на 90 месц кожная, зала вучонага савета. Студэнты стануць гаспадарамі прасторнай спартыўнай залы— адной з лепшых у горадзе.

На здымку: наш галоўны вучэбны корпус.

Фота М. Адарыча.



КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ ДАТ

# І. С. НІКІЦІН

**(Да 100-годдзя з дня смерці.)**



Іван Савіч Нікіцін увайшоў у рускую літаратуру як паэт-дэмакрат. Ён сказаў сваё слова аб народзе, аб яго пакутах, аб яго лепшых якасцях.

Жыць і тварыць Нікіціну давялося ў гады царызма. Перад ім праходзіла:

«Бедность голодная,
грязью покрытая,
Бедность несмелая,
бедность забытая...»

Паэт сумяшчаў у сабе гарачую любоў да народа з нянавісцю да рабаўласніцкай Расіі — «царству скорби и цепей».

Нікіцін нарадзіўся 21 верасня 1824 года ў мяшчанскай сям'і. Пісьменнасці яго вучыў шавец, а затым ён вучыўся ў духоўным вучылішчы і семінарыі. Цяжкім і бязрадасным было яго жыццё. Але, перамагаючы закаснеласць акаляючага быту, паэт кожную вольную хвіліну аддаваў чытанню і паэтычнай творчасці. Ён войстра адчувае і жыва ўспрымае свет цудоўнай рускай прыроды, маляўнічы мір рускіх народных песень і казак. У народнай творчасці паэт убачыў багатую крыніцу для пазнавання жыцця і дум народа. На творах Пушкіна, Бялінскага, Гогаля ён вучыцца, успрымае перадавыя ідэі свайго часу.

Сваю літаратурную дзейнасць Нікіцін пачаў вершам «Русь», гэтым хвалюючым гімнам Радзіме.

«Уж и есть за что,
Русь могучая,
Полюбить тебя,
Назвать матерью».

З глыбокім спачуваннем паказвае аўтар поўныя драматызму малюнкі прыгоннай вёскі, гаворыць аб непасільнай працы прыгоннага селяніна.

Праз шэраг твораў Нікіціна праходзіць тэма цяжкай жаночай долі; горкі ўдзел сялянкі паказаны ў вершах «Жена ямщика», «Рассказ крестьянина». Скаргу за пакутуючую жанчыну ўклаў Нікіцін у свой верш «Не вини одинокую долю».

Але Нікіцін пісаў не толькі аб беднасці і бяспраўі народа. Ён уздымае свой голас да пратэсту супроць прыгнятальнікаў. У вершы «Мщение» гаворыцца аб тым, як прыгонны селянін заступіўся за сваю дачку, за што памешчык з мужыка «вплоть до плеч спустил кожу бедную». Мужык падпаліў панскі двор і забіў насільніка.

Аўтар упэўнен, што народ не заўсёды будзе мірыцца з прыгнечаннем і бяспраўем.

«Уж всходит солнце
земледельца:
Забитый, он на месть не скор;
Но знай: на своего владельца
Давно уж точит он топор.»

У вершы «Хозяин» паэт асудзіў драпежніцкую рэформу 1861 года. Народ пададзен у вобразе закаванага, сцякаючага крывёю Сокала.

«На старом кургане,
в широкой степи,
Прикованный Сокол
сидит на цепи.
Сидит он уж тысячу лет,
Все нет ему воли, всё нет!»

Гэтыя словы пакладзены на музыку, яны сталі любімай песняй рэвалюцыйнай моладзі.

Нікіцін паэт-рэаліст. Адным з яго запаветаў з'яўляецца патрабаванне мастацкай праўды. Ён прызнаны майстра рускага пейзажа. У яго малюнках прыроды, звязаных з працаю простага чалавека, многа святла, цяпла, лірычнай мяккасці. Творчасць Нікіціна поўна глыбокага спачування прыгнечанаму народу і светлай веры ў яго будучае.

Творы Нікіціна перакладзены на многія мовы свету, асабліва папулярны яны ў брацкіх славянскіх краінах.

Яркая і сацыяльна-значымая паэзія Нікіціна выхоўвае ў савецкіх людзях высокае пачуццё патрыятызма.

**Р. ПАІНА.**

*КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ*

# ЦІКАВАЙ РАЗМОВЫ НЕ АТРЫМАЛАСЯ...

*Прасторная зала партыйнай школы. Сюды сабраліся камсамольцы фізічнага факультэта на свой справаздачна-выбарчы сход. Пакуль сход не пачаўся, студэнты весела гамоняць, жартуюць, спрачаюцца.*

*Вакол сакратара камітэта камсамола універсітэта Р. МАЛЮКОВІЧА сабралася група студэнтаў.*

*—Раман, на тваю думку, хто будзе новым сакратаром?*

*—Хлопцы, адкуль жа мне ведаць?*

*—Але ўсё ж?*

*—Выбіраць вам...*

*Гэта быў першы агульны сход фізічнага факультэта. Камсамольская арганізацыя налічвае больш 650 чалавек, а памяшкання, каб сабраць ўсіх камсамольцаў, ва універсітэце няма. Па многалюднасці схода трэба было чакаць, што разгорнецца цікавая і змястоўная размова аб жыцці факультэта, аб справах за прайшоўшы год, аб поспехах і недахопах, якія мелі месца на факультэце.*

*Здавалася, што так яно і будзе, калі пачаў справаздачны даклад Пятро Салаў. Ён адзначыў, што за прайшоўшы год камсамольская арганізацыя факультэта дабілася значных поспехаў. Было праведзена некалькі суботнікаў і нядзельнікаў. Калектыў мастацкай самадзейнасці заняў другое месца ва універсітэце, а спартсмены факультэта заўсёды былі ў ліку першых. На працягу ўсяго года падтрымліваліся шэфскія сувязі з электратэхнічным заводам і вайсковай часцю. Заслугоўвае ўвагі карыснае пачынанне бюро — наладжванне сувязей з бацькамі сваіх студэнтаў. Добра папрацавалі студэнты на бульбе, за што атрымалі не адну грашовую прэмію і падзяку калгаснікаў.*

*Крыху спыніўся ён і на недахопах. Але як?*

*—Наш сакратар залічбіўся—, заўважыў адзін са студэнтаў. І гэта сапраўды. Вельмі ўжо многа лічбаў было ў яго дакладзе. Лічбы застаюца лічбамі, а непасляховасць і дрэнная палітыка-выхаваўчая работа таксама.*

*Дзе прычыны таго, што факультэт займае 1-ае месца па непаспяховасці ва універсітэце? Што было зроблена, каб выкараніць ненармальныя з'явы на факультэце? На жаль, размова аб гэтым на сходзе не пайшла.*

*Прафесар І. Р. Некрашэвіч, выступаючы ў спрэчках, таксама закрануў гэтае пытанне.*

*Далей тав. Некрашэвіч падзяліўся ўспамінамі аб дзейнасці камсамольцаў яго пакалення, жадаючы выклікаць студэнтаў на размову аб маральным вобліку студэнта.*

*Як бы палемізуючы з ім, студэнт 5-га курса В. Бяркоўскі заявіў, што галоўнае для студэнта— веды. Але яму павінна быць вядома, што не толькі веды характарызуюць чалавека.*

*Новы вучэбны год паказвае, што на факультэце не ўсё добра з палітыка-выхаваўчай работай. Пяць студэнтаў выключаны з універсітэта за амаральныя паводзіны. Факультэцкая газета «За навуку» не адлюстроўвае гэтых учынкаў і наогул у ёй адсутнічае дух крытыкі.*

*Студэнт Ул. Лаўрунковіч зусім правільна адзначыў, што факультэцкая дружына здала тэмпы. Тут няма дысцыпліны, прысутнічае дух панібрацтва.*

*У спрэчках выступілі таксама Р. Малюковіч, Ул. Навіцкі, Кірсанаў, В. Скварчэўская і іншыя. У заключэнне выступіў дэкан факультэта М. П. Халімановіч. Ен вельмі добра прааналізаваў работу схода і расказаў аб задачах, якія стаяць перад факультэтам на бліжэйшы час.*

*Сход абраў новы склад бюро. Сакратаром застаўся П. Салаў.*

**Г. ПРАВАЛОВІЧ.**

# НОВАМУ БЮРО—НОВЫ РАЗГОН

ГІСТФАК—адзін з важнейшых гуманітарных факультэтаў універсітэта. Усім вядомы добрыя традыцыі гістарычнага факультэта, якія цяпер з поспехам прадаўжаюць навічкі, папоўніўшыя наш калектыў у гэтым навучальным годзе.

На камсамольскім справаздачна-выбарчым сходзе гістфака, які адбыўся 10 кастрычніка 1961 года, былі падведзены вынікі работы камсамольскай арганізацыі факультэта за мінулы год. У справаздачным выступленні сакратара бюро Уладзіміра Атрошчанка было прыведзена нямала фактаў, якія многае сказалі аб зробленым за год, аб нашых поспехах, планах, а таксама і недахопах.

Выступаючы ў спрэчках па справаздачнаму дакладу, камсамольцы назвалі імёны лепшых студэнтаў—актывістаў Т. Любко, Н. Матвеева, Н. Базылева і іншых. Гэтыя камсамольцы нямала сіл прыклалі для наладжвання грамадскай работы на факультэце.

Упарта працавалі лепшыя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці. Сярод іх трэба назваць камсамольцаў В. Лашчыніна, Н. Нерабееву, М. Бобера, Л. Беляеву, С. Рыжую, Т. Баранаву і многіх іншых; дзякуючы іх стараннасці і вялікай рабоце факультэт на аглядзе мастацкай самадзейнасці заняў першае месца.

Камсамольцы выступілі таксама са справядлівай крытыкай бюро факультэта. У апошні час наглядаўся некаторы спад спартыўнай работы на гістфаку. У выніку, гістарычны факультэт заняў другое месца па масаваму кросу, і нават выдатныя вынікі нашых лепшых спартсменаў Н. Базылева, А. Лаўруковіч, Г. Андрэйчык не выправілі становішча. Гістфак, які многія гады трымаў першынство універсітэта па кросу, уступіў яго. А хіба спартыўная і выхаваўчая работа— не справа камсамольскага бюро?

Многія выступаючыя гаварылі аб стане навуковай работы. Тут у нас не ўсё добра. За мінулы навучальны год на гарадскі агляд мы накіравалі толькі 18 студэнцкіх работ. Тры з іх (І. Сяргеева, Г. Шмыгава, А. Міхайлава) аднесены да першай катэгорыі, шэсць работ—да другой, сем—да трэцяй катэгорыі. Не ў поўную меру выкарыстоўвае гістфак свае сілы ў гэтай галіне.

Выбрана новае бюро. Яму трэба цяпер улічыць усе тыя прабелы, якія дапусціла ранейшае бюро. Перад новым бюро—новыя цікавыя задачы і далі.

**С. СІМАНЬКОВА,**
**студэнтка 5 курса гістфака.**

## З'езду партыі прысвечаны



У мінулую нядзелю парк імя Чалюскінцаў сустрэў удзельнікаў масавага кросу сваімі выдатнымі сцяжынкамі і добрым надвор'ем. Калі пачаліся забегі ў мужчын на дыстанцыю 3000 метраў і ў жанчын—на 800 метраў было няясна, які з факультэтаў зойме першае месца. Але вось выяўляецца, што найбольшай масавасцю прадстаўлены гістарычны, фізічны і юрыдычны факультэты. Калі суддзі падлічылі вынікі, то аказалася, што першынство восеньскага кросу, прысвечанага XXII з'езду партыі, выйграў гістарычны факультэт. За ім ідуць фізікі, юрысты, хімікі, географы і, нарэшце, філолагі, матэматыкі і біёлагі.

**НА ЗДЫМКУ: стартуюць матэматыкі.**

**Е. ЗАЛУСКІ.**

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

Наш адрас:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31. Тэлефон 2-07-19.
Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР.
Зак. 2147. АТ 06682.